ный подход к разработке и использованию КЗ для выпускников культурно-просветительного факультета может стать эффективным направлением совершенствования педагогической практики.

В.Варапаева
С.Паулава

САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТАУ - ВАЖНЫ НАПРАМАК
У ПАДРЫХТОУЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАУ

Навучанне у ВНУ дае будучаму бIблIятэкару агульнаадукацыйную I прафесIйную падрыхтоуку, якая заклIкана стаць базай для наступнага сIстэматычнага павышэння квалIфIкацыI спецыялIста на працягу усёй яго працоунай дзейнасцI. Але гэта праца патрабуе удасканалення. Часта прыходзIцца чуць, што бIблIятэкар - пасраднIк памIж светам кнIг I светам чытачоу. Дакладней будзе сказаць, што бIблIятэкар - гэта пасраднIк памIж асабIстай свядомасцю чытачоу I дакументаванымI грамадскімI ведамI. КнIгI маюць вялIкую каштоунасць I здольнасць задавальняць духоуныя патрэбы грамадства, таму што у Iх зафIксаваны сучасны I мIнулы стан грамадскай свядомасцI, у Iх прадстаулены у агульнадаступнай форме гIстарычна накопленыя свет ведау. МенавIта з Iстотнага аналIзу зместу бIблIятэчнай I бIблIяграфIчнай дзейнасцI вынцякаюць асноуныя квалIфIкацыйныя патрабаваннI да бIблIятэкара-бIблIёграфа. Праблема прафесIяграмы знаходзIцца у стане распрацоукI. У гэтым напрамку вядуць пошукI навуковыя установы I навукова-даследчыя аддзелы дзяржауных бIблIятэк.

Вызначаны прафесIйныя I асабIстыя якасцI бIблIятэкара. ПрафесIйназначныя якасцI (веды, навыкI, уменнI): веданне фIласофскIх, сацыялагIчных, псIхалагIчных, педагагIчных асноу работы с чытачамI, яе методыкI; веданне кнIгI, фонду бIблIятэкI; веданне чытацкIх патрэб I узроуню культуры чытання; валоданне навыкамI культуры чытання I уменне перадаць Iх чытачу; валоданне навыкамI камунIкатыуных зносIн; уменне выкарыстоуваць формы I метады вывучэння чытачоу I работы з ImI; уменне выкарыстоу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваць тэхнічныя сродкі у рабоце з чытачамі. Асабістыя якасці: шырокая адукаванасць, высокі узровень культуры; камунікабельнасць; тактоўнасць; эмпатыя; культура мовы; акуратнасць, дысцыплінаванасць; здольнасць хутка аналізаваць вялікі аб'ем інфармацыі, выяўляць галоўнае, рабіць вывады.

Бібліятэкар як майстра сваёй справы фарміруецца у працэсе практычнай дзейнасці. Але гэта не азначае, што яго станаўленне адбываецца стыхійна, без спецыяльнага навучання. Майстэрства бібліятэкара - гэта сінтэз тэарэтычнай і метадычнай яго падрыхтоўкі. Чаму ж належыць першынство - зместу або методыцы? На гэта пытанне можна адказаць адназначна - зместу. Менавіта ён у першую чаргу вызначае якасць работы. Зместу належыць першынство яшча і таму, што методыка абслугоўвае змест. Але ж службовая роля методыкі адносна зместу зусім не гаворыць аб яе малой значнасці. Больш таго, без добрай методыкі можа быць згублена для слухачоў значная частка карыснай інфармацыі, якая складае змест дзейнасці бібліятэкара. Методыка, з'яўляючыся формай, не можа парадзіць свайго зместу. Але ж у філасофскім аспекце, форма - пачатак актыўны: калі форма няудалая, яна можа значна уплываць на змест, пагаршаючы і дэфармуючы яго.

У выніку мы можам вызначыць паняцце "прафесійнае майстэрства бібліятэкара" як сукупнасць ведаў, навыкаў, уменняў, якія ва узаемасувязі з высокаразвітым мысленнем і асабістымі якасцямі дазваляюць яму дабівацца вырашэння выхаваўчых і інфармацыйных задач.

Мы не ставім сваей мэтай прааналізаваць усе напрамкі падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай навучальнай установе. Спынімся на самастойнай рабоце як важным напрамку набыцця прафесійных ведаў і удасканалення асабістых якасцей. Вядома, што самастойная работа - гэта разнастайныя віды індывідуальнай і групавой пазнавальнай дзейнасці, накіраванай на засваенне праграмы, а таксама самаадукацыя і самаразвіццё студэнта без непасрэднага удзелу педагога. Сфарміраваны навык самастойнай работы з'яўляецца базай забеспячэння бесперапыннай адукацыі. Фарміраванне гэтага навыку здзяйсняецца у працэсе мэтанакіраванай працы. Выкладчык быў і застаецца галоўнай фігурай у арганізацыі вучэбнага працэсу і самастойнай работы студэнтаў. Яго дзейнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ажыццяуляецца па трох напрамках: падрыхтоука вучэбна-метадычнай дакументацыI для правядзення заняткау I кIраунIцтва самастойнай работай студэнтау; аудыторная работа са студэнтамI з разнастайнымI формамI кантролю; рэалIзацыя самастойнай работы студэнтау у пазааудыторнай дзейнасцI.

На факультэце накоплены значны вопыт падрыхтоукI вучэбна-метадычнай дакументацыI. Аднак эфектыунасць выкарыстоування яе студэнтамI не вывучалася. Таму мы правялI экспрэс-апытванне 100 студэнтау бIблIятэчнага факультэта. ВысветлIлася, што асноуная маса студэнтау звяртаецца да вучэбна-метадычнай дакументацыI толькI для азнаямлення з пытаннямI I лIтаратурай да семIнарскIх I практычных заняткау. Каб студэнт звяртауся да Iншых матэрыялау, магчых дачыненне да самастойнай работы, павIнна быць абавязковая устаноука выкладчыка з наступным кантролем выканання. У метадычных матэрыялах студэнтау больш за усё вабяць творчыя заданнI, якIя развIваюць Iх здольнасцI, даюць магчымасць трансфармIраваць веды (дзелавыя гульнI, рашэнне сIтуацыйных задач I г.д.). ТакIх заданняу у метадычных матэрыялах павIнна быць значна больш. У працэсе ж аудыторнай работы выкладчык непасрэдна мае магчымасць актывIзаваць самастойную творчую дзейнасць студэнтау. Гэта добра рэалIзуецца у праблемных падборах I выкладаннI Iм лекцыйнага матэрыялу, прымяненнI актыуных метадау навучання.

ПавелIчэнне аб'ёму IнфармацыI, якая стала уласнасцю чалавецтва, прымушае з асцярогаю падыходзIць да адбору матэрыялау, якI педагог прапануе слухачам. Не менш важна ранжыраванне IнфармацыI, размеркаванне яе па узроуням, на якIх патрабуецца яе засваенне. Варта устанавIць, калI трэба гаварыць толькI аб знаёмстве з тымI альбо IншымI з'явамI, у якIх выпадках важна тэарэтычнае разуменне, веданне сутнасцI з'явы, не важна практычнае уменне вырашаць тую альбо Iншую задачу, а калI гэта уменне павIнна быць даведзена да ступенI навыку. У працэсе лекцыI выкладчык перадае студэнтам самыя разнастайныя веды. У практычнай жа дзейнасцI на аснове гэтых ведау фармIруюцца вызначаныя навыкI I уменнI. МенавIта актыуныя формы навучання даюць магчымасць набываць веды, уменнI I навыкI (лагiчныя дыялогI, "круглыя сталы", дзелавыя гульнI I Інш.). Яны выкарыстоу...

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у студэнтау уменне задаваць пытаннI, лаканIчна адказваць, весцI дыскусIю, шукаць рацыянальныя шляхI засваення матэрыялу. Самыя разнастайныя формы кантролю за самастойнай работай студэнтау: франтальнае апытванне, пIсьмовыя адказы на праблемныя пытаннI, калёквIумы, IндывIдуальныя гутаркI - выпрацоуваюць у студэнтау здольнасць да пераключэння увагI, уменне хутка аналIзаваць вялIкI аб'ём Iнфармацыi, выяуляць галоунае, рабIць вывады.

Пазааудыторная работа студэнтау складаецца з сIстэматычнага чытання лIтаратуры да практычных I лабараторных заняткау, азнаямлення з прапанаванай выкладчыкам спецыяльнай лIтаратурай па праблемах, больш вузкIх пытаннях, з выканання творчых заданняу тыпу напIсання рэферата, рэцэнзII на артыкул, правядзення даследчай работы у бIблIятэцы пры падрыхтоуцы курсавых, дыпломных I навуковых работ. АсаблIва варта адзначыць навукова-даследчую работу студэнтау. Пры яе правядзеннI выяуляюцца прафесIйныя веды I асабIстыя якасцI будучых спецыялIстау. МенавIта тут студэнт мае магчымасць сам ставIць пэуную мэту I рэалIзаваць яе, выкарыстоуваючы набытыя веды. ТакIм чынам, тэорыя знаходзIць сваю падтрымку у дзейнасцI, змест навучання дыялектычна звязваецца з практыкай.

На наш погляд, вялIкIя магчымасцI для спалучэння тэорыI I практыкI маюць пакуль што фармальна Iснуючыя вучэбна-вытворчыя аб'яднаннI. Удзел у Iх дзейнасцI дазваляе больш эфектыуна арганIзаваць самастойную работу студэнтау, укаранIць яе вынIкI у практыку I ажыццявIць рубежны кантроль. Напрыклад, тэму "Масавая работа бIблIятэкI" мы поунасцю прапануем студэнтам для самастойнага вывучэння. Метадычна яна забяспечана. Будучым спецыялIстам неабходна вывучыць прапанаваную лIтаратуру, прааналIзаваць яе, вылучыць галоунае - такIм чынам фармIруецца уменне чытаць спецыяльную I мастацкую лIтаратуру. Далей, адпаведна плана работы бIблIятэкI праводзIцца канкрэтнае мерапрыемства па прапагандзе кнIгI. Пры гэтым на аснове самастойна набытых ведау студэнты складаюць план падрыхтоукI I праграмму правядзення мерапрыемства. На падрыхтоучым этапе выконваецца цэлы шэраг творчых заданняу: арганIзацыя аглядау лIтаратуры, выставак, гутарак; у працэсе IндывIдуальнай работы з

чытачамI рэалIзуюцца не толькI прафесIйныя, але I асабIстыя якасцI будучага спецыялIста: камунIкабельнасць, эмпатыя, культура мовы, навыкI зносIн. Правядзенне самога мерапрыемства з чытачамI у форме распрацаваных дзелавых гульняў "БIблIятэкар аддзела абслугоўвання" I "Працоўны дзень у дзIцячай бIблIятэцы", наступны аналIз яго дазваляюць меркаваць аб эфектыўнасцI самастойнай работы, намецIць шляхI яе удасканалення.

ТакIм чынам, самастойная работа студэнтаў з'яўляецца у сучасных умовах адным з важных фактараў накаплення ведаў I на Iх аснове фармIравання уменняў I навыкаў. Але ж эфектыўнасць яе залежыць ад правIльнага планавання, арганIзацыI, упраўлення I кантролю. Абавязковай умовай з'яўляецца падмацаванне ведаў практычнай дзейнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ